**СЯРКУЦЦЕЎ** Генадзь Васілевіч (н. 17.3.1937, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1994), праф. (2000). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999). Скончыў Ленінградскі ін-т інжынераў чыг. транспарту (1964). У 1957—76 на інж.-тэхн. і пед. рабоце ў г. Валгаград. З 1979 у Бел. філіяле Усесаюзнага НДІ прафтэхадукацыі. З 1985 дырэктар СПТВ №103 г. Мінска, з 1991 — Мінскага вышэйшага прафес. вучылішча чыг. транспарту, з 2001 Мінскага прафес.-тэхн. каледжа чыг. транспарту. Навук. працы па праблемах дыдактыкі, педагогікі, методыкі і тэхналогіі прафес. навучання, арганізацыі выхаваўчага працэсу, вучнёўскага самакіравання.

*Тв.:* Организация учебно-воспитательного процесса в ПТУ: новые подходы. Мн., 1991; Научно-педагогические основы подготовки рабочих кадров. Мн., 1998; Технология преподавания «Всемирной истории» по методу «погружения». Мн., 1999 (разам з І.Г.Буко); Методика преподавания дисциплины «Устройство и эксплуатация пассажирских вагонов» по методу «погружения». М., 2001.

*В.У.Чэчат.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ